**Філіпчык Дзяніс Уладзіміравіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт (Мінск, Беларусь)*

# СУЧАСНЫЯ АДУКАЦЫЙНЫЯ ТЭХНАЛОГІІ Ў МУЗЕІ ЯК СРОДАК ЗАХАВАННЯ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ

Музеі Рэспублікі Беларусь прыкладаюць значныя намаганні для захавання нематэрыяльнай культурнай спадчыны (далей НКС), да якой паводле Канвенцыі ЮНЭСКА 2003 г. «Аб ахове нематэрыяльнай культурнай спадчыны» адносяцца «звычаі, формы прадстаўлення і ўяўлення, веды і навыкі, а таксама звязаныя з імі інструменты, прадметы, артэфакты і культурныя прасторы, якія прызнаюцца супольнасцямі, групамі і, у некаторых выпадках, асобнымі людзьмі ў якасці часткі іх культурнай спадчыны. Такая нематэрыяльная культурная спадчына, якая перадаецца ад пакалення да пакалення, пастаянна ўзнаўляецца супольнасцямі і групамі ў межах іх навакольнага асяроддзя, ва ўзаемадзеянні з прыродай, і іх гісторыяй, а таксама фарміруе ў іх пачуццё самабытнасці і пераемнасці, садзейнічаючы тым самым павазе да культурнай разнастайнасці і творчасці чалавека» [1].

Захаванне НКС адрозніваецца ад захавання звычайных музейных прадметаў. Для нематэрыяльнай спадчыны захаваннем з’яўляецца не фіксацыя такой спадчыны, а наадварот, трансляцыя спадчыны наступным пакаленням. Адпаведна ў музейных умовах перадача элементаў НКС новым пакаленням адбываецца падчас рэалізацыі культурна-адукацыйных мерапрыемстваў. Менавіта праз выкарыстанне сучасных адукацыйных тэхналогій музеі Рэспублікі Беларусь спрыяюць захаванню НКС.

Расійская даследчыца музейнай педагогікі М.Ю. Юхневіч вылучае 10 базавых форм культурна-адукацыйнай дзейнасці музея: экскурсія, лекцыя, кансультацыя, навуковыя чытанні (канферэнцыі, сесіі, пасяджэнні), клуб (гурток, студыя), конкурс (алімпіяда, віктарына), сустрэча з цікавым чалавекам, канцэрт (літаратурны вечар, тэатралізаванае прадстаўленне, кінасеанс), свята, гістарычная гульня [2, с. 63]. Для актуалізацыі НКС і папулярызацыі ведаў аб ёй музеі Рэспублікі Беларусь выкарыстоўвалі шырокі спектр форм культурна-адукацыйнай дзейнасці. Прааналізаваўшы вопыт выкарыстання беларускімі музеямі НКС у культурна-адукацыйнай дзейнасці, мы прыйшлі да высновы, што розныя формы культурна-адукацыйнай работы ў рознай ступені спрыялі захаванню НКС. На наш погляд, найбольш эфектыўныя з пункту гледжання захавання НКС такія формы культурна-адукацыйнай работы, як музейна-педагагічныя заняткі (цыклы заняткаў, адукацыйныя праграмы), музейныя аб’яднанні (клубы, гурткі), майстар-класы. Яны спрыялі павышэнню жыццяздольнасці элементаў НКС, непарыўнасці практыкі перадачы гэтай спадчыны, дазвалялі ў межах музея трансліраваць уменні, навыкі, тэхналагічныя прыёмы, уяўленні, звязаныя з нематэрыяльнай спадчынай.

Эфектыўнай формай культурна-адукацыйнай дзейнасці, якая спрыяла захаванню НКС, непарыўнай яе перадачы, з’яўляўся музейны

клуб. На прыклад, пры Браслаўскім раённым аб’яднанні музеяў з 1984 г. дзейнічаў клуб народных майстроў «Ля возера» [3, с. 50]. У склад клуба ўваходзілі супрацоўнікі музея, мастакі, мясцовыя майстры – носьбіты НКС. Удзельнікі клуба захоўвалі традыцыі саломапляцення, выцінанкі, кавальства, ткацтва, дрэваапрацоўкі, ганчарства і інш. Адметна тое, што ў межах клуба адбывалася перадача традыцыі ад яе носьбітаў да музейных супрацоўнікаў, якія самі рабіліся носьбітамі НКС. Так супрацоўніца музея А.У. Кавальчык пераняла ткацкае майстэрства ад мясцовага майстра. У 2003 г. у клубе «Ля возера» налічвалася больш 60 чалавек.

З 1992 г. пры Браслаўскім гісторыка-краязнаўчым музеі дзейнічаў гурток па ткацтве, якім кіравала мясцовая ткачыха А. І. Чапулёнак [4, с. 145]. Адметна тое, што ўдзельнікі гуртка не толькі авалодвалі ўменнем ткаць, але і займаліся зборам матэрыялаў па ткацтве, даследаваннем мясцовых узораў ручнікоў, абапіраліся пры стварэнні новых вырабаў на мясцовую ткацкую традыцыю. Адпаведна, дзейнасць гуртка спрыяла і захаванню НКС і яго вывучэнню.

Некаторыя музеі распрацоўвалі і рэалізоўвалі доўгатэрміновыя адукацыйныя праграмы. Так спецыялістамі Веткаўскага музея стараабраднiцтва і беларускіх традыцый імя Ф.Р. Шклярава яшчэ ў 1986 г. была распрацавана праграма заняткаў школы старажытнай і сучаснай народнай культуры (па матэрыялах мясцовай традыцыі). Гэтай праграмай, разлічанай на 12 гадоў навучання, навуковыя супрацоўнікі музея планавалі ахапіць дзяцей ва ўзросце ад 5 да 17 гадоў. Аўтарам ідэі і распрацоўшчыкам праграмы з’яўлялася тагачасны дырэктар музея Г.Р. Нячаева. У аснову навучання былі пакладзены «культуралагічны падыход да засваення матэрыяльнай і духоўнай спадчыны ў канкрэтным кантэксце традыцыйнай культуры» [5, с. 3]. Праграма была разлічана на 37 гадзін, а тэматыка заняткаў дазваляла засвоіць цэлы пласт традыцыйнай культуры рэгіёну, у тым ліку і НКС. Вучні знаёміліся з тэхнікамі апрацоўкі дрэва, значэннем колераў і арнаменту ў традыцыйнай культуры, ткацтвам, уяўленнямі аб светабудове, народнай кулінарыяй і інш. Частка заняткаў праходзіла з удзелам носьбітаў НКС (майстроў, выканаўцаў народных песняў). Асноўнымі метадамі навучання музейныя супрацоўнікі выбралі гульню і моўнае мысленне.

Некалькі музейна-педагагічных заняткаў, што знаёмілі з НКС, распрацавалі ў Цэнтры гісторыі і культуры Акцябрскага раёна. З мэтай захавання і адраджэння традыцыйнай культуры ў 2001 г. быў распрацаваны занятак «Музей і дзеці», а ў 2010 г. музейна-педагагічная праграма «Традыцыйная культура і дзеці», задачай якой з’яўляецца адраджэнне нацыянальнай аўтэнтычнай культуры [6, с. 76]. На занятках дзеці засвойвалі веды аб мясцовым побыце, традыцыйных святах і абрадах. Пры цэнтры дзейнічала этна-студыя «Батлейка», дзе з 1997 г. адбываліся паказы батлеечных спектакляў, разлічаныя на наведвальнікаў ад 6 да 12 год. Паказы з’яўляліся інтэрактыўнымі і прадугледжвалі магчымасць удзелу ў батлеечным спектаклі ў якасці лялькаводаў наведвальнікаў [7, л. 6].

З мэтай перадачы НКС дзецям у 2009 г. кіраўніцтва Дрыбінскага гісторыка-этнаграфічнага музея арганізавала дзіцячае аматарскае

аб’яднанне «Катрушнік». Яго ўдзельнікі засвойвалі тэхналогію сухога і мокрага валяння, вывучалі гісторыю і асаблівасці шапавальства Дрыбіншчыны, а таксама выраблялі валёнкі, сувенірную прадукцыю, цацкі і г.д. Раз на месяц адбываліся сумесныя сустрэчы ўдзельнікаў дзіцячага аб’яднання з майстрамі клубу «Шапавал» [8]. Гэта спрыяла пераемнасці ў дзейнасці аб’яднанняў, дыялогу паміж носьбітамі НКС розных пакаленняў. Па меркаванні музеязнаўца В. С. Сапанжы, менавіта музейныя аб’яднанні «дазваляюць уключыць музейную камунікацыю ў агульнакультурныя камунікацыйныя працэсы, звязаныя з захаваннем і інтэрпрэтацыяй гісторыка-культурнай спадчыны» [9, с. 162].

Гісторыка-культурны музей-запаведнік «Заслаўе» з’яўляўся першай музейнай установай у Беларусі, дзе ў 1990 г. быў створаны сектар музейнай педагогікі. Ініцыятарам гэтага доўгатрміновага праекта была супрацоўніца музея-запаведніка В.У. Міронччык. Першыя музейныя заняткі, распрацаваныя ў 1989–1990 гг., адрасавалі дашкольнікам і малодшым школьнікам. Праходзілі яны ў экспазіцыі «Рамёствы і промыслы Беларусі». У 1997 г. для малодшых школьнікаў былі распрацаваны музейна-педагагічныя заняткі рознай тэматыкі: «Вербная нядзеля» – «Вялікдзень», «Веснавыя абрады і абрадавыя святы», «Купальскія спевы», «Дажынкі», «Звычаі і побыт нашых продкаў», «Кавальскае рамяство ў Заслаўі на мяжы XIX–XX стст.», «Дзяды», «Сімвалы продкаў у беларускіх ручніках» [10, л. 16].

Бачна, што культурна-адукацыйная дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь спрыяла захаванню НКС. Музейныя супрацоўнікі выкарыстоўвалі магчымасці сучасных адукацыйных тэхналогій для захавання НКС, упрыватнасці гульнявыя і інтэрактыўныя. Сярод форм культурна-адукацыйнай работы для захавання нематэрыяльнай спадчыны найбольш эфектыўнымі былі музейна-педагагічныя заняткі (цыклы заняткаў, адукацыйныя праграмы), майстар-класы і музейныя аб’яднанні (клубы, гурткі). Менавіта праз рэалізацыю гэтых форм дзейнасці музеі спрыялі перадачы НКС новым носьбітам, забеспячэнню непарыўнасці практыкі перадачы нематэрыяльнай спадчына і, адпаведна, яе жыццяздольнасці. Часцей за ўсё музеі звярталіся да музейна-педагагічных заняткаў. З аднаго боку найбольшую колькасць заняткаў іх аўтары прысвяцілі рамёствам і промыслам, традыцыйным цырымоніям, традыцыйнай ежы, але з другога боку былі раскрыты тэмы вусных традыцый і формам выражэння, выканальніцкіх мастацтваў, міфалогіі і светапогляду. Заняткі, як правіла, прадугледжвалі тэарэтычную частку, дзе ўдзельнікі знаёміліся з пэўнай вобласцю НКС ці элементам, і практычную, падчас якой адбывалася засваенне канкрэтных уменняў, навыкаў, нормаў паводзін, звязаных з нематэрыяльнай спадчынай.

## Бібліяграфічныя спасылкі


1. Text of the Convention for the Safeguarding of the Intangible Cultural Heritage // Official website of The United Nations Educational, Scientific and Cultural Organization [Electronic resource] – Mode of access: http://www.unesco.org/culture/ich/index.php?lg=en&pg=00006. – Date of access: 01.02.2019.
2. Юхневич, М. Ю. Я поведу тебя в музей : учеб. пособие по музейной педагогике. – М-во культуры РФ. Рос. ин-т культурологии. – М., 2001. – 223 с.

3. Касцюкевіч, С. Дзейнасць народных майстроў Браслаўшчыны / С. Касцюкевіч // Браслаўскія чытанні : Матэрыялы VI-й навук.-краязн. канф., прысвеч. 150-й гадавіне з дня нараджэння брасл. лекара, грамад. дзеяча С. Нарбута (1853–1926), 7–8 мая 2003 г. / рэд. рада: К. Шыдлоўскі [і інш.]. – Браслаў, 2003. – С. 50–52.
4. Зінкевіч, Э.У. Калекцыя ручнікоў Браслаўскага раённага музейнага аб'яднання / Э.У. Зінкевіч // Ручнік у прасторы і часе: матэрыялы Міжнар. навук.-практ. канф., 19–20 лістап. 1998 г., Мінск / агул. рэд. В.А. Лабачэўскай. – Мінск : БелІПК, 2000. – С. 144–147.
5. Аз, букі, ведзі – глаголь дабро!: школа старажытнай і сучаснай народнай культуры пры Веткаўскім музеі народнай творчасці (па матэрыялах мясцовых традыцый): праграма заняткаў / Веткаўскі музей народнай творчасці. – Гомель: ВПП «Сож», 1999. – 40 с.
6. Курсевіч, К. А. «Берагіня» – працяг культурных традыцый Рудабельшчыны // Историческое наследие города Турова : материалы науч.-практ. конф. (г. Туров, 9–10 апр. 2015 г.) / редколл.: С. В. Рязанов (гл. ред.), В. В. Домосканов, Н. Н. Мезга. – Гомель, 2015. – С. 74–77.
7. Матэрыялы анкетнага апытання па тэме: «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991 – 2016 гг. Гомельская вобласць» // Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. – Фонд 9. Воп. 5. Спр. 38. Л. 38.
8. Дрыбінскі раённы гісторыка-этнаграфічны музей захоўвае і перадае маладому пакаленню тэхналогію шэрстабітна-валяльнага промысла // Афіцыйны сайт раённай газеты «Савецкая вёска» [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступа : http://www.dribin.by/?p=17201. – Дата доступа : 24.01.2019.
9. Сапанжа, О. С. Стратегии коммуникационных процессов в контексте модернизации музейной деятельности // Триумф музея? : сб. науч. тр. – СПб.: «Осипов», 2005. – С. 160–171.
10. Матэрыялы анкетнага апытання па тэме: «Дзейнасць музеяў Рэспублікі Беларусь па ахове і папулярызацыі нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў 1991 – 2016 гг. Мінская вобласць» // Архіў ІМЭФ НАН Беларусі. – Фонд 9. Воп. 5. Спр. 41. Л. 47.

**Шейнов Виктор Павлович**
*Республиканский институт высшей школы БГУ (Минск, Беларусь)*

## ЭФФЕКТИВНАЯ ТЕХНОЛОГИЯ ПРОВЕДЕНИЯ ПРАКТИЧЕСКИХ ЗАНЯТИЙ ПО УПРАВЛЕНЧЕСКИМ ДИСЦИПЛИНАМ

Практические занятия по любой учебной дисциплине играют важную роль в триаде «знания – умения – навыки», выражающей и целеполагание, и содержательную сущность процесса обучения. От степени эффективности практических занятий зависит успех усвоения и закрепления *знаний*, *умения* ими воспользоваться в нужный момент и обретение интеллектуальных *навыков* – доведенных до автоматизма приёмов и способов решения возникающих на практике задач.

Представляемая в данном докладе «Технология активного группового обучения» (ТАГО) направлена на повышение эффективности практических занятий по дисциплинам управленческого цикла

Потребность в подобной технологии первоначально возникла из необходимости преодолеть трудности, которые постоянно возникают как в системе повышения квалификации преподавателей вузов и колледжей, так и при повышении квалификации управленческого персонала пред-